М. А. БЯСПАЛАЯ

# РОД ТЫШКЕВІЧАЎ У МЕМУАРНАЙ ЛІТАРАТУРЫ / TIŠKEVIČIŲ GENTIS Į MEMUARŲ

M. BIASPALAYA

# THE ACTIVITY OF THE TYSHKEVICH FAMILY MEMBERS IN A MEMOIRS

*For centuries, members of the Tyshkevych family are occupied an important place in the social and cultural life of the Grand Duchy of Lithuania and Belarus. On the basis of memoirs the auther reveals the activities and personal qualities of some members of the family, like Ludwig, Vintsent, Tadeush, Kanstantine, Yaustakhe, who lived and worked in the 1st half of the 19th century.*

Аб ролі Тышкевічаў у гісторыі і культуры нашай краіны ўжо сфарміравалася дастаткова шырокае кола навуковай і папулярнай літаратуры. Мы ставілі за мэту адлюстраваць ацэнку магнацкаму роду Тышкевічаў, як дзяржаўным дзеячам і прыватным асобам, у мемуарнай літаратуры і дзённікавых запісах. На наш погляд, гэта дазваляе даведацца аб малавядомых старонках іх дзейнасці, звычаях, учынках, вольным часе, бліжэйшым акружэнні. Не наша задача, ды і права, ацэньваць асобасныя якасці герояў дакументальных запісаў, але аб'ектыўна прааналізаваць вынікі іх дзейнасці, падаецца, можа быць цікавым.

У якасці крыніц намі выбраны мемуары другой паловы XVIII ст. і дзённікавыя запісы сярэдзіны XIX ст. У іх занатаваны якраз перыяд згасання адной з ліній роду Тышкевічаў – Скуміных, якія не насілі графскі тытул, і актыўнай дзейнасці другой галіны – графаў Тышкевічаў. Цікавасць выклікаюць не толькі героі ўспамінаў, але і іх аўтары, аб якіх мы далей таксама згадаем.

Пачнём з асобы Людвіка Тышкевіча-Скуміна (1750–1808). Апошні прадстаўнік гэтай галіны роду, што бярэ свой пачатак у Беларусі ў XVI ст., Л. Тышкевіч у любых, і самых неспрыяльных, абставінах меў сваю пазіцыю і заўжды адстойваў яе. Ён займаў самыя высокія пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім – пісара, падскарбія гетмана польнага, а з 1793 г. – маршалка Вялікага Княства Літоўскага. У ліку нямногіх гетман Тышкевіч адмовіўся паставіць свой подпіс пад актам Таргавіцкай канфедэрацыі, якую падтрымлівала Расійская імперыя. У якасці маршалка ён старшынстваваў на апошнім сойме Рэчы Паспалітай у 1793 г. і быў вымушаны падпісаць акт аб яе другім падзеле і дамову з Расіяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Антырасійскія настроі Людвіка Тышкевіча не засталіся па-за ўвагай улады, і пасля падзелаў Рэчы Паспалітай уся яго маёмасць была секвестравана, але ён «цвёрда перанёс гэты сумны вынік свайго патрыятызму» (тут і далей пераклад наш. – *М. Б.*) [3, с. 22]. Так ацаніла грамадзянскую пазіцыю Людвіка Тышкевіча яго дачка – графіня Ганна Патоцкая. Яна пакінула вельмі цікавыя мемуары, з якіх можна даведацца аб многіх падзеях пачатку XIX ст.: аб французскіх эмігрантах у Польшчы, у тым ліку сям'і будучага французскага караля Людовіка XVIII, аб наведванні маёнтка Патоцкіх (Віланова) Аляксандрам I, аб сустрэчах з Напалеонам і яго світай і шмат інш.

Ганна Тышкевіч (у замужжы Патоцкая) была адзінаю дачкой Людвіка Тышкевіча і Канстанцыі Панятоўскай – пляменніцы апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Са зместу мемуараў вынікае, што бацькі аўтаркі мемуараў жылі ў «раз'ездзе» – бацька ў Вільні, маці, часцей за ўсё, у Беластоку ў маёнтку сваёй роднай цёткі, сястры караля, жонкі кароннага гетмана Ізабэлы Браніцкай. Жыла Ганна да шлюбу разам з маці, аднак асоба бацькі – як пісала дачка, «гэты шляхетны характар» – выклікала ў яе павагу і любоў, што яна і паспрабавала перадаць сваім дзецям, для якіх і пісала мемуары.

Так, графіня Патоцкая апісвае адзін з эпізодаў, які адбыўся з Л. Тышкевічам падчас яго знаходжання ў Санкт-Пецярбургу, па яе меркаванні, «каб дабіцца захавання Літоўскага статута» (маецца на ўвазе Статут 1588 г.). У «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (т. 6, кн. 1) падаюцца звесткі, што Людвік Тышкевіч двойчы наведваў расійскую сталіцу: першы раз на чале дэлегацыі ад сойма Рэчы Паспалітай, другі – на чале дэлегацыі для складання (прынясення) прысягі імператрыцы.

Дэпутацыя, піша Г. Патоцкая, прадстаўляла знатнейшых вяльможаў Рэчы Паспалітай, была прынята Кацярынай II «з той ласкавасцю, якой яна ўмела спакушаць сэрцы». Дэпутаты былі запрошаны да ўдзелу ў пяці шыкоўных прыёмах і «лічылі сваім абавязкам з'яўляцца на кожны з іх» [3, с. 23]. З гэтымі словамі пераклікаецца ацэнка, якую прыводзіць у сваіх мемуарах вядомы дзяржаўны дзеяч Расійскай імперыі і вялікі патрыёт Польшчы, змагар за яе незалежнасць князь Адам Чартарыйскі. Ён пісаў: «…штодзённа з'яўляліся такія, хто думаў, што настаў зручны момант праз абыякавасць да лёсу радзімы і здраду набыць міласці міністраў і двара. Іх былыя заслугі здаваліся ім недастаткова ўзнагароджанымі, і яны падвойвалі свае подласці, каб дамагчыся

большага. Нам не аднойчы прыходзілася чырванець за такія ганебныя паводзіны некаторых суайчыннікаў. Але нас з імі не змешвалі: палякаў, якія знаходзіліся ў Пецярбургу, дзялілі на дзве розныя катэгорыі па іх якасцях, настроі і ўчынках» [5, с. 59].

Тое, як трымаўся ў гэтых абставінах Людвік Тышкевіч, выклікае ў дачкі відавочную павагу. Яна ўспамінае, што бацька з’яўляўся да двара, толькі калі гэтага патрабавала ўскладзенае на яго даручэнне. Імператрыца, у пэўнай ступені здзіўленая такімі паводзінамі, не ўстрымалася і выказала графу Тышкевічу сваё незадавальненне, «рэзка заўважыла, што толькі ён адзін не паказвае цікавасці і не імкнецца пабачыць усе цуды прыдворных свят». У адказ былы гетман з глыбокім паклонам сказаў, што ў тым становішчы, у якім знаходзіцца яго краіна, ён не можа ўтойваць свае пакрыўджаныя пачуцці і што, на яго думку, не варта азмрочваць бліскучыя святы непазбежным смуткам» [3, с. 23]. У перадачы Г. Патоцкай адказ Кацярыны II гучаў так: «Я спачуваю, як жанчына, тым няшчасцям, якія я, як гасударыня, не магу адвесці з палітычных меркаванняў» [3,
с. 23]. Імператрыца зняла з сябе маленькі гадзіннік, упрыгожаны ізумрудамі, перадала графу і папрасіла прыняць гэты падарунак як доказ яе незвычайнай павагі і захаплення яго шляхетнымі паводзінамі. У хуткім часе быў зняты секвестр з маёмасці Людвіка Тышкевіча.

Такім чынам, са старонак мемуараў Ганны Патоцкай паўстае вобраз суайчынніка, смелага чалавека, патрыёта, якому лёс наканаваў выконваць пэўную ролю ў апошнія часы існавання самастойнай беларускай дзяржавы.

Графская галіна роду Тышкевічаў таксама пакінула адметны след у палітычным і культурным жыцці Беларусі. Спынімся на неардынарнай асобе графа Вінцэнта Тышкевіча (1757–1816), сына генерал-лейтэнанта літоўскага войска Антонія Казіміра Тышкевіча і Тэрэзы з Тызенгаўзаў, сучасніка Людвіка Тышкевіча. Дастаткова цікавыя і насычаныя ўспаміны аб выніках дзейнасці В. Тышкевіча ў маёнтку Свіслач, які ўспадкаваў у 1816 г., пакінуў граф Леан Патоцкі. Ён, пачынаючы з 1815 г., часта наведваў Свіслач, яго маці, Юзэфа з Салагубаў, другім шлюбам была замужам за Тадэвушам Тышкевічам, пляменнікам Вінцэнта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Вінцэнт Тышкевіч

З мемуараў Л. Патоцкага даведваемся, што В. Тышкевіч рана згубіў бацькоў, але, атрымаўшы значную спадчыну, меў магчымасць увайсці ў вышэйшыя колы Рэчы Паспалітай. Гэтаму садзейнічаў і шлюб з пляменніцай караля Марыяй Тэрэзай Панятоўскай, ініцыятарам якога, як і ў выпадку з Людвікам Скумін-Тышкевічам і Канстанцыяй Панятоўскай, выступіў сам кароль Станіслаў Аўгуст. Як сведчыць мемуарыст: «Маладзёна, які вяртаўся з Парыжа праз Варшаву, [кароль] затрымаў, звабіў у двор, даў яму чын літоўскага рэферэндара, абвешаў ардэнамі і звёў недабраную пару» [4, с. 11]. Аднак шлюб Вінцэнта і Марыі Тэрэзы не задаўся: яна не пакахала Вінцэнта і выконвала волю караля пад прымусам, таму з’ехала са Свіслачы праз год, ён жа ўсё жыццё кахаў толькі яе. Марыя Тэрэза была роднай сястрой Юзафа Панятоўскага – будучага нацыянальнага героя Польшчы. Перад смерцю ад ран брат перадаў ёй права карыстацца ўсім сваім багаццем. Як Марыя Тэрэза распараджалася ім, мемуарысты не паведамляюць, толькі яе ўнучатая пляменніца графіня Ганна Патоцкая пра жыццё Марыі Тэрэзы пасля Свіслачы напіша, што яе цётка з’яўлялася каля чвэрці стагоддзя «вернай рабой французскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палітычнага дзеяча Талейрана і нават пахавана ў яго маёнтку Валансэй» [3, с. 141].

Аб надзвычай своеасаблівай сямейнай пары Вінцэнта і Марыі Тэрэзы апавядае ў сваіх мемуарах Юльян Урсын Нямцэвіч (1758–1841), які нарадзіўся ў Скоках Берасцейскага павета ў заможнай шляхецкай сям'і, атрымаў адукацыю ў рыцарскай школе ў Варшаве, служыў ад'ютантам князя А. Чартарыйскага, падчас паўстання 1794 г. быў ад'ютантам і сакратаром Т. Касцюшкі, разам з ім зведаў палон, затым выезд у ЗША, вяртанне на радзіму, шмат падарожжаў.

У маладыя гады ён спрабуе пісаць і перакладаць, у чым атрымлівае падтрымку князя А. Чартарыйскага. Яго ўспаміны напісаны цікава, з добрым гумарам, разам з тым захоўваюць рэальнасць расказу.

Ю. Нямцэвіч занатаваў у сваіх мемуарах паездку ў складзе світы князя А. Чартарыйскага, які меў пасаду маршалка Літоўскага трыбунала, у Вільню у 1783 г. Па дарозе з Варшавы князь спыняўся ў розных месцах, наведаў і Свіслач, падарожжа ў якую Нямцэвіч называе «адной з памятных вандровак». Ён піша: «Тышкевіч такога ж розуму, як і яго поўнае цела, аднак добры і ўладарны гаспадар, меў дзіўныя густы і самыя смешныя ў сваім родзе. Найбольшым яго шчасцем, наймілейшай забавай было рана адправіць самому імшу, а ўвечары прыбрацца ў адзенне кабеты» [1, с. 135]. Побач і характарыстыка жонкі В. Тышкевіча Марыі Тэрэзы: «Поўнай працілегласцю яму была яго жонка, з найгоршай фантазіяй, у цэлым натура рамантычная, жывая, цудоўная, з мужчынскай смеласцю не любіла нічога іншага, як коней, спаборніцтвы і мужчынскія забавы» [1, с. 136]. І аўтар мемуараў, і ўладальнік Свіслачы былі фактычна аднагодкамі, на момант сустрэчы ім было крыху больш за 20 год, і можна ўявіць здзіўленне маладых афіцэраў паводзінамі маладога мужа: «…калі гаспадар адпраўляў зранку імшу, а ўвечары на канапе ў чапцы і мантэльцы абвейваў сябе веерам, прымушаючы сваю руку цалаваць і прымаючы ўшанаванні ў моладзі, а гаспадыня лётала на кані па палях, праз равы і козлы са збітых калкоў і каня свайго садзіла. Моцна ўсё гэта нас забаўляла…» [1, с. 136].

Ю. Нямцэвіч яшчэ некалькі разоў звяртаецца да апісання іншых падобных «забаў» В. Тышкевіча, аднак мы не будзем на іх далей засяроджваць увагу, звернемся да гаспадарчай дзейнасці графа ў Свіслачы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нашай крыніцай будуць успаміны Л. Патоцкага, бо Ю. Нямцэвіч пісаў аб маладым Тышкевічу, а граф Патоцкі – аб яго сталых гадах і выніках упартай, прадуманай працы. Атрымаўшы маёнтак у спадчыну, Вінцэнт перабудаваў «бясформенны і брудны гарадок зусім нанова», заклаў парк галандскага тыпу, правёў у ім каналы, заснаваў вялікі заасад, у якім гадаваліся лані і алені. Ад папярэдніх уласнікаў застаўся толькі драўляны палац. У цэнтры быў арганізаваны рынак з гандлёвымі радамі, ад якога пачыналіся пад шнур забудаваныя шэсць вуліц. Штогод у жніўні месяцы ў Свіслачы адбываўся буйны кірмаш, дзеля чаго быў пабудаваны каменны гмах з 48 склепамі для гандлю, пяць пастаялых двароў, аптэка, шынок з більярдам. У мястэчку дзейнічалі грэка-каталіцкая царква і касцёл.

Граф В. Тышкевіч быў вельмі багаты чалавек, да таго ж умеў лічыць грошы, а не толькі траціць. Свіслач прыносіла яму каля 10 000 чырвоных злотых гадавога даходу, Лагойск – каля 5000 і трэці маёнтак ва Украіне – таксама 10 000. Адзін мільён злотых быў пакладзены пад працэнты. Ён уводзіў у абарачэнне сродкі толькі тады, калі закрываў бюджэт бягучага года. Правіла ў яго было такое: упраўляючы маёнтка павінен быў у канцы кожнага года аддаваць яму «ні менш, ні больш таго, як ён раз пастанавіў». Калі даход быў большы, упраўляючы мог браць лішак сабе, калі меншы – даплочваць з уласных сродкаў. Леан Патоцкі прыводзіць выпадак, калі ўпраўляючы ўкраінскага маёнтка прывёз на 2000 дукатаў больш, чым было пастаноўлена, граф падараваў яму лішак, але пазбавіў пасады за парушэнне яго волі [4, с. 59].

З мемуараў вынікае, што граф В. Тышкевіч быў вельмі дбайны гаспадар, які не цураўся ўчынкаў, адпавядаючых папулярным тады поглядам фізіякратаў. Адкрываў вясковыя школкі, сам прызначаў настаўнікаў, а апеку даручаў мясцовым пробашчам. Сяляне ў яго ўладаннях выконвалі павіннасць тры дні на тыдзень з канём і адзін – без каня, а таксама чатыры «гвалты» падчас сенакосу і жніва, шарваркі па рамонце дарог і мастоў. На выпадак неўраджаю граф Тышкевіч «завёў у сябе магазіны і на першы заклад падараваў 500 бочак жыта і столькі ж яравога збожжа». Акрамя гэтага, адкрыў камунальную касу, у якую ўнёс першапачатковы капітал у памеры 3000 рублёў срэбрам. Селянін мог пазычыць «з магазіна на хлеб ці на сяўбу», то, «калі аддаваў, павінен быў дасыпаць да пазычанай азіміны гарнец». Грашовая пазыка давалася пад 5 % гадавых [4, с. 61]. Мэтаю ўладальніка маёнтка было тое, каб сяляне працэнтамі ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уласнага капітала плацілі падаткі і маглі адкупіцца ад рэкрутчыны, выплаціўшы 1000 рублёў асігнацыямі.

Аб знешнім выглядзе і асобасных якасцях графа Вінцэнта Тышкевіча скажам коратка, хаця Л. Патоцкі ўдзяляе гэтаму аспекту значнае месца ў сваіх мемуарах. Ён апавядае, што граф быў «характару мілага, нават слабага», дрэнна разбіраўся ў людзях, з гэтай нагоды – нясмелы і ўпарты. Меў наймілейшаю слабінку – жаночыя плёткі, ён ахвотна іх слухаў. «Што адна сказала, па гарачых слядах паўтараў другі, такім чынам неаднаразова пасварыўшы сяброvак». Урэшце мусіў іх мірыць, рабіў адной і другой багатыя падарункі. Знешне ён быў вельмі поўны ўжо ў маладосці, блізарукі, затое «розум яго рэдка калі адпачываў, пастаянна тварыў, складаў, папраўляў, дасканаліў, парадкаваў». У навукі не паглыбляўся, хаця веды ў іншых вельмі цаніў. Другою яго натураю, заўважае Л. Патоцкі, былі рэгулярнасць і акуратнасць, «кожнае яго дзеянне адбывалася ў прызначаную пару», а ў палацы панавала «найвялікшая чысціня, даведзеная нават да крайнасці». Некаторыя сучаснікі называлі графа В. Тышкевіча «арыгінал без копіі» [4, с. 37–38].

Закранём пытанне тэатра ў Свіслачы. Яго арганізавала жонка Тышкевіча – Марыя Тэрэза, у ім разыгрываліся французскія п’есы. Ю.У. Нямцэвіч успамінае, што падчас наведвання ім Свіслачы была пастаўлена французская камедыя «Heureusement», у якой і ён выконваў адну з роляў [1, с. 137]. Пасля ад’езду Марыі Тэрызы ў Варшаву ў тэатральнай зале пачалі ладзіць выступленні артыстаў падчас кірмашоў.

Кірмаш у Свіслачы быў шырока вядомы, на яго прыязджалі купцы з Пецярбургу, Адэсы, Кішынёва, Астрахані і іншых месц. Ім бясплатна выдзяляліся магазіны, нагляд за парадкам ажыццяўляла адміністрацыя маёнтка. Купцам хрысціянскага веравызнання неаднаразова выдавалі білеты на тэатральныя спектаклі. Імянітыя госці таксама былі заняты кожны дзень рознымі забавамі. З’язджаліся ў Свіслач прадстаўнікі самых вядомых фамілій – Радзівілаў, Сапег, Патоцкіх, Валовічаў, Чацвярцінскіх, Ельскіх і інш.

Л. Патоцкі піша, што граф Тышкевіч выклапатаў прывілей на закладку ў Свіслачы гродзенскай губернскай гімназіі. У «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (т. 6, кн. 1) гэты факт падаецца некалькі па-іншаму: «Па прапанове дырэктара вучылішчаў Гродзенскай губерні Ю. Касакоўскага і са згоды В. Тышкевіча» ў 1804 г. у Свіслачы была заснавана гімназія. Уладальнік Свіслачы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выдзяліў пад гімназію 1000 злотых і часовыя драўляныя будынкі, абавязаўся ў будучым зрабіць іх мураванымі. Ён не паспеў ажыццявіць задуманае, але завяшчаў на развіццё гімназіі 30 тыс. рублёў срэбрам. Граф Л. Патоцкі удакладняе, што спадчыннік В. Тышкевіча, «знайшоўшы ў касе 200 000 злотых [30 тыс. рублёў срэбрам] і значныя матэрыялы, прыгатаваныя для гэтай мэты, выдатна выканаў волю завяшчальніка».

Вельмі цікавымі, на наш погляд, з'уляюцца ўспаміны Л. Патоцкага аб арганізацыі навучальнага працэсу ў гімназіі і пазіцыі В. Тышкевіча. Па-першае, ён матэрыяльна падтрымліваў настаўнікаў, якім не хапіла пакояў у будынку гімназіі, выдзяляючы ім грошы на наёмнае жыллё. З графскага двара пастаўлялася і паліва. Бяднейшыя студэнты таксама атрымлівалі дапамогу для найму пакояў, а многім ён аплачваў кошт найму поўнасцю. Па-другое, граф клапаціўся аб маральным выхаванні навучэнцаў. Дзеля гэтага падбіраў найлепшых выкладчыкаў, завёў «паліцыю», якая паведамляла яму аб паводзінах кожнага студэнта, і настойваў, каб за самую найменшую правіннасць студэнт нёс адказнасць, а часам і сам прысутнічаў на студэнцкіх судах. Тых жа, хто добра вучыўся і паводзіў сябе, ухваляў, рабіў ім неспадзяваныя падарункі – малодшых частаваў цукеркамі ці садавінай, старэйшым дарыў кніжкі. Вясной наладжваў студэнтам маёўку, наведваў экзамены і сам уручаў узнагароды выпускнікам [4, с. 47–48]. Такім чынам, граф Вінцэнт Тышкевіч не толькі садзейнічаў адкрыццю гімназіі, фінансава падтрымліваў яе дзейнасць і клапаціўся пра яе будучыню, але браў самы актыўны ўдзел у навучальным і выхаваўчым працэсе, дэманструючы сваю зацікаўленасць і разуменне значымасці правільна арганізаванай адукацыі.

Незадоўга да смерці ён склаў тэстамэнт, які заверыў афіцыйна. Сваім багаццем распарадзіўся наступным чынам: Лагойск адпісаў Пію Тышкевічу, украінскія ўладанні – тамашняй галіне роду, а Свіслач – Юзафу Тышкевічу, «палкоўніку, вялятыцкаму старосце», з умоваю выканаць усе абавязкі тэстамэнту. Калі, напрыклад, Юзаф будзе не згодны з умовай, то Свіслач пераходзіла да яго сына Міхала, калі і ён не пагодзіцца – да Тадэвуша, а калі і той будзе не згодны – да іншых прадстаўнікоў роду і, урэшцэ рэшт, – да ўрада з тымі ж абавязкамі. Што ж гэта за абавязкі? Трэба было выплаціць за адзін раз 750 000 польскіх злотых і штогод плаціць па 2000 дукатаў пажыццёвай пенсіі жонцы графа Марыі Тэрэзе Тышкевіч. На працягу трох гадоў спадчынніку трэба было ўзвесці мураваныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

будынкі гімназіі, а за 10 гадоў – касцёл, аптэку, кафенгаўз, пяць корчмаў і ўсе дамы, якія стаялі вакол рынку, 300 000 злотых адпісваліся Т. Тышкевічу і другія 300 000 – іншым членам сям'і, дамачадцам і даўнім слугам, з якіх ніводзін не быў забыты. У тэстамэнце была прыпіска аб мільёне польскіх злотых, размешчаных пад працэнты ў нясвіжскіх Радзівілаў, і аб 200 000 злотых на будаўніцтва гімназіі [4, с. 61].



Тадэвуш Тышкевіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэтая ўмова аказалася непрымальнай для Юзафа і Міхала Тышкевічаў, а Тадэвуш пагадзіўся.

Вінцэнт Антоніевіч-Казіміравіч Тышкевіч, «граф на Лагойску і Бярдычаве», вялікі рэферэндарый Вялікага Княства Літоўскага і кавалер многіх ордэнаў Рэчы Паспалітай памёр 12 сакавіка 1816 г. «у маёнтку Дубоя каля Пінска ў сваёй крэўнай пані Кажанеўскай».

Генерал Тадэвуш Тышкевіч служыў у польскім войску, удзельнічаў у паўстанні 1794 г. Падчас вайны 1812 г. трапіў у палон, з якога вярнуўся праз два гады, і ў 1815 г. ажаніўся з маці

Ляона Патоцкага, які «шанаваў свайго вотчыма нават больш за бацьку». Тадэвуш Тышкевіч выконвае ўмовы тэстамэнту графа Вінцэнта Тышкевіча. Так, ён будуе мураваную гімназію ў Свіслачы, падтрымлівае імкненне яе кіраўніцтва да пашырэння колькасці выкладаемых прадметаў і выкладчыкаў. Напрыклад, у 1817 г. у гімназіі было 6 асноўных класаў, 10 выкладчыкаў і 281 вучань, а таксама да 1823 г. – падрыхтоўчы клас. У сталым ужо ўзросце маючы амаль 60 год, Т. Тышкевіч бярэ ўдзел у паўстанні 1830–1831 гг. і становіцца старшынёй цэнтральнага ўрада ў Літве. Пасля падаўлення паўстання яго ўладанні, у тым ліку і Свіслач, былі секвестраваны, а сам ён выехаў спачатку ў Дрэздэн, а потым у Парыж, дзе і памёр у красавіку 1852 г. ва ўзросце 78 гадоў [4, с. 62–64].

У сярэдзіне XIX ст. прыкметная роля магнацкіх родаў у сацыякультурным жыцці беларускіх губерняў перайшла да малодшага пакалення графаў Тышкевічаў: Міхала (1828–1897) – уладальніка Астрашыцкага Гарадка, валожынскага ўладальніка Яна (1831–1892) і, безумоўна, Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў. Асноўныя моманты іх дзейнасці, асабліва братоў Тышкевічаў, разглядаліся ў літаратуры, напрыклад працах А. А. Гужалоўскага.

Мы будзем карыстацца такой дакладнай крыніцай, як дзённікавымі запісамі Міхала Галубовіча, доктара багаслоўя і царкоўнага права, спачатку дзеяча ўніяцкай царквы, а з 1839 г. – праваслаўнай, з 1853 г. архіепіскапа Мінскага. Ён быў у сяброўстве з многімі шляхецкімі сем’ямі Беларусі, у тым ліку і з усімі Тышкевічамі. Найбольш часта сустракаўся з Канстанцінам Тышкевічам, мабыць, яны былі ў дастаткова блізкім сяброўстве, таму што Тышкевіч не забываў прывозіць архіепіскапу гасцінцы са сваіх замежных паездак. М. Галубовіч запісвае 10 кастрычніка 1858 г., што граф прывёз з Вены падарунак – алтарык з выявай Прасвятой Дзевы на эмалі ў дубовай аправе з жоўтымі блёсткамі: «Я незвычайна рады такому гасцінцу… і выпішу пару такіх на падарункі…» [6, с. 178].

Тышкевічы былі паважанымі асобамі, яны часта наведвалі дом губернатара, дзе іх прымалі з пашанай, а калі здаралася патрэба, і ўлады звярталіся да іх. Напрыклад, са слоў М. Галубовіча, падчас візіту імператара Аляксандра II 4 верасня 1858 г. у Мінск для дэкарацыі пакояў у губернатарскім доме губернатар Э. Т. Кэлер прасіў мэблю, срэбны посуд і інш. у Міхала Тышкевіча і ў другіх сямей [6, с. 166]. У Астрашыцкі Гарадок да Міхала Тышкевіча

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часта наведваліся высокія госці, у тым ліку генерал-губернатар У. І. Назімаў, губернатар Э. Т. Кэлер і інш. Гасцей частавалі абедам, як піша М. Галубовіч, яны «вельмі ласкава былі прыманы». Абавязковай праграмай візітаў з’яўлялася наведванне карціннай галерэі.

Міхал Тышкевіч меў багаты збор польскіх залатых і срэбных манет (у 1854 г. прадаў яе Эмерыку Чапскаму), старажытнай зброі, срэбнага посуду XVIII ст., некалькі дзесяткаў польскіх і нямецкіх срэбных кубкаў, вырабы з фаянсу, фарфору, шкла, шмат карцін фламандскай, французскай і інш. мастацкіх школ, у тым ліку А. Рыдэля, а таксама тры вялікія альбомы акварэлі 1850–1860 гг. Некаторыя карціны былі прададзены ў Парыжы ў 1864 г., частку купіў Ян Тышкевіч і перавёз у свой маёнтак Вака, каля Вільні; асобныя падораны. Архіў уяўляў збор старажытных пергаментаў з бронзавымі зашпількамі, змешчаны ў гданьскіх шафах. Віленскі музей старажытнасцей атрымаў ад М. Тышкевіча 1000 гравюр на медзі і дрэве, бібліятэку з 3000 тамоў старажытнай і гістарычнай літаратуры [2, с. 195–196].

Знакаміты быў Міхал Тышкевіч, як і яго валожынскі сваяк Ян, сваімі паляваннямі, удзельнічаць у якіх многія лічылі за гонар.

Новае пакаленне Тышкевічаў змагло ў пэўным сэнсе паразумецца з уладамі, аднак у душы яны заставаліся патрыётамі свайго краю. У якасці прыкладу прывядзём запіс у дзённіку архіепіскапа за 15 сакавіка 1859 г. У гэты дзень за абедам у губернатара прамаўлялі спічы. Канстанцін Тышкевіч, са слоў М. Галубовіча, выказаўся, што Літва, «не зважаючы на сталы прыгнёт, засталася вернай сваім ідэям, непахіснай і энергічнай» [6, с. 204]. Занепакоены губернатар патрабаваў падаць гэтую прамову ў пісьмовым выглядзе, але ў яе граф гэтыя словы не ўставіў, хаця быў ён чалавек не баязлівы, дазваляў сабе і іншыя вольнасці. Напрыклад, аднойчы пры гасцях у сваім лагойскім палацы сказаў, што адкупшчык Гінзбург даў губернатару Кэлеру 15 тыс. рублёў, аб чым ведае кожны рамізнік, і да сказанага дадаў аб губернатаўскай фаварытцы-акцёрцы. Безумоўна, Кэлер быў зняважаны, аднак мог толькі скардзіцца М. Галубовічу. Хутчэй за ўсё, К. Тышкевіч быў невысокай думкі аб асобе губернатара, таму што гаварыў аўтару дзённіка: «…у Мінску да прыезду Кэлераў не мелі інтрыг і сварак» [6, с. 197].

З праваслаўным архіепіскапам Галубовічам у лагойскіх Тышкевічаў стасункі былі добрыя, што ён не раз адзначае ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзённіку. У сваіх паездках па епархіі архіепіскап не аднойчы наведваў Лагойск, правіў службу ў мясцовай царкве. На ёй прысутнічалі Канстанцін, яго сын Аскар, брат Яўстах, калі не былі ў ад'ездзе.

У адным з запісаў М. Галубовіч заўважыў, што ўсе Тышкевічы прысутнічалі на службе, а потым «прынялі мяне вельмі ветліва, гаспадыня таксама. Міла правёў час». Зранку архіепіскап планаваў ехаць далей, але «Канстанцін Тышкевіч так захапіўся апавяданнямі пра сваю працу на Віліі (падарожжа па рацэ Віліі. – *М. Б.*), што я выехаў толькі ў палове 9-й» [6, с. 239].

М. Галубовіч быў добра знаёмы і з Яўстахам Тышкевічам, асобай таксама з настойлівым характарам. Дзейнасць Я. Тышкевіча па стварэнні музея выклікала перапіску паміж віленскім генерал-губернатарам і гродзенскім губернатарам. Першы вельмі хацеў даведацца ад другога «о степени пользы, так и о средствах для устройства музея». Дзякуючы намаганням Я. Тышкевіча ў першую чаргу, музей старажытнасцей у Вільні быў адкрыты. Яго экспазіцыя карысталася вялікай папулярнасцю, аб чым сведчаць і нататкі М. Галубовіча. Пры кожным наведванні Вільні, ён наведваў і музей [6, с. 269, 272].

У дзённіку архіепіскапа няма падрабязных апісанняў гаспадарчай дзейнасці Тышкевічаў, як і іншых герояў яго запісаў, толькі дзе-ні дзе сустракаюцца словы «добрая гаспадарка», «багаты дом» і да т. п. Тым не менш дзённікавыя запісы, якія ён вёў на працягу амаль 10 год, пачынаючы з 1858 г., раскрываюць некаторыя моманты паўсядзённага жыцця пакалення Тышкевічаў, якія прыйшлі на змену магнату Вінцэнту Тышкевічу і генералу Тадэвушу Тышкевічу.

У сувязі з тым, што мы абмежаваліся толькі мемуарнай літаратурай, шырокамаштабнай карціны дзейнасці роду Тышкевічаў не магло атрымацца. Нас цікавілі тыя малавядомыя факты і падзеі, характарыстыкі асобасных якасцей прадстаўнікоў гэтага роду, якія раскрывалі б іх у паўсядзённасці, грамадзянскім стаўленні да навакольнага жыцця.

1. *Гладышчук, А. А.* Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі : гіст.-дакумент. нарыс / А. А. Гладышчук. – Мінск : Літ. і мастац., 2009. – 288 с. ; Гродзенскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Фонд 1. – Воп. 21. – Спр. 913. – Арк. 1.

2. *Карпечэнко, Г. А.* Прыватныя калекцыі Міхала Тышкевіча ў Астрашыцкім Гарадку ў XIX ст. / Г. А. Карпечэнко // Ельскія чытанні: матэрыялы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канф. «Шляхецкая культура Беларусі XIX – пачатку XX ст. (Дудуткі, 27 крас. 2013 г.). – Мінск : Кнігазбор, 2013. – С. 192–198.

3. *Потоцкая, А.* Мемуары графини Потоцкой. 1794–1820 / А. Потоцкая; пер. с фр. Н. Кудрявцевой. – М. : Жуковский : Кучково поле, 2005. – 304 с. ; Мемуары графини Потоцкой (с сокращениями) : пер. с фр. // Исторический вестник. – 1897. – № 4. – www.vostlit.infj/Texts/Dokumenty/Polen/XVIII/1780–1800/Potockaja_ A/text. phtml.

4. *Патоцкі, Л.* Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі ; укл., прадм., камент. А. М. Філатавай ; пер. з пол. І. У. Саламевіча. – Мінск : Полымя, 1997. – 270 с.

5. *Чарторижский, А.* Воспоминания и письма / А. Чарторижский. – М. : Захаров, 2010. – 592 с.

6. *Янушкевіч, Я.* Дыярыюш з XIX стагоддзя. Дзённікі Міхала Галубовіча як гістарычная крыніца / Я. Янушкевіч. – Мінск : изд. В. Хурсік, 2003. – 350 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ